на зямлі, погляды наведвальнікаў міжволі ўзносяцца да неба – да празрыстага купала, які мусіў сімвалізаваць купал павержанага рэйхстага. Але мы бачым вельмі далікатныя вітражныя сонечныя промні, у якіх узносяцца буслы, анёлы нашай зямлі. А там, на самым версе – блакітна-сіняе неба, падобныя да белых буслоў, да анёлаў – аблокі. У музеі падчас экскурсіі гучыць шмат класічнай музыкі. Гэты лад – пераадоленне выпрабаванняў; наша памяць, жалоба і адначасова стваральнае святло робяцца лейтматывам як архітэктурнага вобліка, так і мастацка-эстэтычнай канцэпцыі музея.

*1.* Лексикон нонклассики. Художественно-эстетическая культура XX века / Под общей редакцией В. В. Бычкова. – М. : Росспэн. 2003. – 608 с.

*2.* htt:\\ru.m.wikipedia.org.

## ТЫПАЛАГІЧНЫЯ РЫСЫ КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ

***І. І. Бамбешка,*** *старшы выкладчык*
*кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Палітру музейнага жыцця Беларусі цяжка ўявіць без краязнаўчых музеяў[1]. У айчынным музеязнаўстве тэрмін «краязнаўчы» ўжываецца пры разглядзе музеяў у межах іх класіфікацыі па профілі, які вызначаецца спецыялізацыяй музея, сувяззю яго з канкрэтнай навукай ці відам мастацтва, тэхнікай, вытворчасцю і яе галінамі. Сярод гэтых груп вылучаюць музеі комплекснага профілю, дзейнасць якіх звязана з некалькімі навуковымі дысцыплінамі ці напрамкамі ведаў. Самай шматлікай групай сярод іх з’яўляюцца менавіта краязнаўчыя музеі, комплекснасць якіх з’яўляецца іх характэрнай рысай. У адпаведнасці з афіцыйнай статыстыкай у структуры Міністэрства культуры Рэспублікі Бе-

[1] У артыкуле аналізуюцца толькі музеі сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ларусь на 01.01.2018 г. дзейнічала 150 музеяў, з якіх комплексныя складаюць 57 %, гістарычныя – 28 %, мастацкія – 10 %, літаратурныя – 5 % [2]. Па нашых падліках, у сістэме названага міністэрства на 01.11.2018 г. дзейнічала 82 музеі, якія па назве, складзе фондаў і па змесце дзейнасці з'яўляюцца краязнаўчымі, што складае 54,7 % ад агульнай колькасці музеяў. Краязнаўчыя музеі дзейнічаюць ва ўсіх абласных цэнтрах краіны, у многіх раённых, а таксама шэрагу населеных пунктаў пасялковага ўзроўню. Такая тэрытарыяльная распаўсюджанасць і фондавая разнастайнасць робіць краязнаўчыя музеі ўнікальнай з'явай айчыннай культуры, якая практычна адсутнічае ў краінах далёкага замежжа.

Наяўнасць у фондах крыніц усіх відаў па розных галінах ведаў дазваляе суадносіць іх з цэлым комплексам навуковых дысцыплін. Падобныя музеі маюць дачыненне да ўсіх сфер жыцця рэгіёна, таму аб'ектыўна ад музея патрабуецца фіксацыя працэсаў змен і тэндэнцый у развіцці рэгіёна ў дадзены момант. У краязнаўчых музеях акумулюецца і прэзентуецца адабраны і асэнсаваны вопыт многіх пакаленняў, што пражывалі на канкрэтнай тэрыторыі. Кожнае новае пакаленне ў цэлым і асоба ў прыватнасці засвойвае духоўную і матэрыяльную спадчыну мясцовай супольнасці. Гэты шлях сацыяльнай і духоўнай адаптацыі вядомы чалавецтву са старажытных часоў, паколькі ўзнаўленне рода як адзінага цэлага ўключае не толькі фізічнае, але і духоўнае, што азначае негенетычную магчымасць перадачы ўменняў і навыкаў, традыцый, звычаяў і абрадаў, выхаванне пачуцця прыналежнасці да сям'і, роду, нацыі і г. д. [4, с. 10]. Такія асаблівасці краязнаўчага музея дазваляюць нам прапанаваць уласнае вызначэнне краязнаўчага музея як *шматфункцыянальнага і комплекснага інстытута сацыяльнай памяці, прызначанага для захавання, інтэрпрэтацыі і трансляцыі наступным пакаленням гісторыка-культурнай спадчыны лакальным соцыумам.*

Краязнаўчыя музеі можна з поўным правам аднесці да інстытутаў, якія садзейнічаюць захаванню і актуалізацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гісторыка-культурнай спадчыны, што знаходзіцца на яе тэрыторыі; маральнаму і адукацыйнаму развіццю насельніцтва. Шырокі спектр праблем, на вырашэнне якіх з самага пачатку узнікнення накіроўвалася іх дзейнасць, дазваляе лічыць асноўнымі характарыстыкамі такіх музеяў менавіта комплекснасць і шматфункцыянальнасць.

Як музеі іншых профіляў, краязнаўчыя валодаюць характарыстыкамі ў адпаведнасці з прынятай у айчыннай музеялогіі класіфікацыі па шэрагу крытэрыяў: па профілі, па арганізацыйных тыпах, па спосабе рэалізацыі функцыі дакументавання (дамінантнаму тыпу захоўваемых у музеі каштоўнасцей), па формах уласнасці, прававому статусу і адміністрацыйна-тэрытарыяльным прынцыпе. Намі прапанаваны яшчэ адзін крытэрый: *па колькасці і наяўнасці структурных частак*.

У межах *профільнай* класіфікацыі можна вылучыць наступныя падгрупы краязнаўчых музеяў: гісторыка-краязнаўчыя музеі (35 музеяў); літаратурна-краязнаўчыя (1); музеі народнай славы (4); эколага-краязнаўчыя (2); уласна краязнаўчыя (40).

У адпаведнасці з класіфікацыяй па *арганізацыйных тыпах* усе даследуемыя беларускія рэгіянальныя краязнаўчыя музеі адносяцца да *навукова-асветніцкага (масавага)* тыпу. Яны арыентаваны на самую шырокую аўдыторыю, іх фонды актыўна выкарыстоўваюцца ў культурна-адукацыйных мэтах. На аснове фондавых збораў, дзе сканцэнтраваны прадметныя сведчанні працэсаў, што адбываліся ў прыродзе і грамадстве на пэўнай тэрыторыі, ствараюцца стацыянарныя экспазіцыі і часовыя выстаўкі. Іх галоўная задача – праз экспазіцыйна-выставачную культурна-адукацыйную дзейнасць актуалізаваць гісторыка-культурную спадчыну рэгіёна.

Па спосабе *рэалізацыі функцыі дакументавання* (дамінантнаму тыпу захоўваемых у музеі каштоўнасцей) сярод рэгіянальных краязнаўчых музеяў можна вылучыць як *музеі калекцыйнага тыпу* (іх пераважная большасць), так і *ансамблевага тыпу* (Гомельскі палацава-паркавы ан-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

самбль). Музеі *калекцыйнага тыпу* будуюць сваю дзейнасць на аснове традыцыйнага збору рэчавых, пісьмовых, выяўленчых матэрыялаў адпаведна іх профілю. Такім чынам, функцыю дакументавання яны здзяйсняюць шляхам камплектавання і захавання фонда музейных прадметаў. У аснове дзейнасці *музеяў ансамблевага тыпу* ляжаць помнікі архітэктуры з іх інтэр'ерамі, прылягаючай тэрыторыяй, прыродным асяроддзем. Функцыю дакументавання яны выконваюць шляхам захавання ці аднаўлення ансамбля нерухомых помнікаў і характэрнага ім асяроддзя. Названы падзел у пэўнай ступені носіць умоўны характар, паколькі краязнаўчыя музеі калекцыйнага тыпу могуць размяшчацца ў помніках архітэктуры (напрыклад, Дзяржаўны Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей (ДГГАМ)[2], Віцебскі абласны краязнаўчы музей (ВАКМ)[3] і іншыя), што захоўваюцца ў гістарычнай недатыкальнасці, а музеі-ансамблі не абмяжоўваюць сваю дзейнасць толькі захаваннем помнікаў архітэктуры, але яшчэ і ствараюць профільныя калекцыі.

*Па форме ўласнасці* ўсе рэгіянальныя краязнаўчыя музеі, якія разглядаюцца ў артыкуле, адносяцца да дзяржаўных.

Падзел *па прававым статусе* вызначае становішча музея ў іерархіі музейнай сеткі, яго правы і абавязкі. У гэтай катэгорыі краязнаўчыя музеі падзяляюцца на галаўныя (іх пераважаючая большасць) і філіялы (Браслаўскі гісторыка-краязнаўчы музей, Полацкі краязнаўчы музей і некаторыя іншыя).

*Па адміністрацыйна-тэрытарыяльным прынцыпе* ў складзе рэгіянальных краязнаўчых музеяў вылучаюць музеі абласныя, раённыя і гарадскія.

*Па крытэрыі колькасці і наяўнасці структурных частак ў складзе краязнаўчага музея* можна вылучыць монаструктурныя і поліструктурныя музеі. Да монаструктурных краязнаўчых музеяў адносяцца тыя, якія не маюць філіялаў, адпаведна, у складзе поліструктурных, дзейнічае адзін ці

---

[2] Размяшчаецца ў будынках Старога і Новага замкаў у Гродне.

[3] Размяшчаецца ў будынку Віцебскай ратушы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

больш філіялаў. Так, монаструктурных рэгіянальных краязнаўчых музеяў налічваецца 51, а поліструктурных – 30. Найбольш складанымі структурнымі ўтварэннямі з’яўляюцца Мазырскі аб’яднаны краязнаўчы музей, які мае 5 філіялаў, па 4 філіялы маюць Брэсцкі абласны краязнаўчы музей і Пухавіцкі раённы краязнаўчы музей, 3 філіялы ў складзе ВАКМ, ДГГАМ і Столінскага раённага краязнаўчага музея, 4 музеі маюць па 2 філіялы і 20 музеяў – па 1 філіяле. Пераўтварэнне кразнаўчых музеяў у цэлы музейны комплекс стала адной з характэрных рыс мяжы XX–XXI стст.

У апошнія дзесяцігоддзі структура сеткі краязнаўчых музеяў стала больш складанай, рухомай, што вымушае ўносіць пэўныя змены ў класіфікацыйныя схемы і вызначаюць новыя крытэрыі для вылучэння адпаведных груп музеяў.

Аналізуючы тыпалагічныя характарыстыкі краязнаўчых музеяў, непазбежна паўстае праблема суаднясення паняццяў «краязнаўчы», «мясцовы», «рэгіянальны» і «правінцыяльны» музей. Пры першасным разглядзе яны супадаюць, паколькі і краязнаўчыя, і рэгіянальныя музеі дакументуюць працэсы і з’явы, якія адбываліся на пэўнай тэрыторыі. Падабенства названых катэгорый пацвярджаецца наяўнасцю ў многіх рэгіянальных і ва ўсіх краязнаўчых музеях самастойнай этнаграфічнай калекцыі, якая з’яўляецца «самым выразным маркерам самабытнасці гісторыка-культурнай спадчыны кожнай этнічнай групы» і якая ў кожным рэгіянальным і краязнаўчым музеі не падобна да аналагічнай калекцыі суседняга музея. Такая сітуацыя тлумачыцца спецыфікай гістарычнага развіцця краіны. Тэрыторыя Беларусі ніколі не была шчыльна заселенай, а ў XVI–XVII стст. у перыяд найбольш актыўнага фарміравання беларускага этнасу з-за інтэнсіўных ваенных дзеянняў колькасць насельніцтва зменшылася амаль напалову. Гэтыя абставіны і абумовілі пэўную абмежаванасць тэрыторый, на якіх працэс фарміравання этнасу працягваўся паралельна з замацаваннем лакальных адметнасцей традыцыйнай культуры [1, с. 134].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Катэгорыя «рэгіянальны» музей утвараецца пры падзеле ўсяго аб'ёму музеяў па крытэрыі культурнай значнасці ці па маштабах дзейнасці, калі вылучаюцца музеі цэнтральныя, рэгіянальныя і мясцовыя [3, с. 53]. Названая катэгорыя звязана са значэннем і значнасцю музея ў рэгіёне, у межах якога ён дзейнічае. Краязнаўчы ж музей, аб чым гаварылася вышэй, – гэта вынік падзелу музеяў па профілі, гэта значыць па ступені блізкасці да пэўнай навуковай дысцыпліны ці галіны вытворчасці, ці да цэлага шэрагу дысцыплін. Такім чынам, рэгіянальны музей можа быць як краязнаўчым (комплексным) (напрыклад, Магілёўскі абласны краязнаўчы музей імя Е. Р. Раманава і інш.), так і манапрофільным (напрыклад, мастацкім, як Магілёўскі абласны мастацкі музей імя П. В. Масленікава, і г. д.). Як і ў межах краіны, у складзе рэгіянальных музеяў краязнаўчыя складаюць найбольшую колькасць. У той час краязнаўчы музей можа быць як рэспубліканскага, так і рэгіянальнага і мясцовага значэння.

Такім чынам, галоўныя тыпалагічныя рысы краязнаўчага музея – поліфункцыянальнасць і комплекснасць, якая тлумачыцца дакументаваннем розных бакоў жыцця (прыродных умоў, гістарычнага развіцця, эканомікі, побыту і культуры) канкрэтнага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага рэгіёна ці населенага пункта. Для правядзення класіфікацыі сістэмы рэгіянальных краязнаўчых музеяў былі вызначаны наступныя крытэрыі: па профілі, па арганізацыйных тыпах, па спосабе рэалізацыі функцыі дакументавання (дамінантным тыпе захоўваемых у музеі каштоўнасцей), па формах уласнасці, прававым статусе і адміністрацыйна-тэрытарыяльным прынцыпе па колькасці структурных падраздзяленняў.

Было таксама прааналізавана суаднясенне паняццяў «краязнаўчы», «мясцовы», «рэгіянальны» і «правінцыяльны» музей, вызначаны іх падабенствы і адрозненні.

---

1. *Бяспалая, М. А.* Рэгіянальныя музеі Беларусі: сучасны стан і перспектывы развіцця / М. А. Бяспалая // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2012. – № 1. – С. 134–142.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*2.* Информация об итогах деятельности организаций культуры в 2017 году и задачах на 2018 г. // Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь [Афіцыйны сайт]. – Рэжым доступа: http://kultura.by/by/karysnaya-infarmacyuya. – Дата доступа: 28.10.2018 г.

*3.* Словарь актуальных музейных терминов // Музей. – 2009. – № 5. – С. 47–68.

*4. Шляхтина, Л. М.* Социальные практики современного музея: границы доступности / Л. М. Шляхтина // Вопросы музеологии. – 2014. – № 2(10). – С. 10–15.

# СИМВОЛИКА НАЗВАНИЙ БЕЛОРУССКИХ МУЗЫКАЛЬНЫХ КОМПОЗИЦИЙ НАЧАЛА XXI в. (на примере творчества О. Подгайской, К. Яськова и А. Даньшовой)

***В. В. Беглик**, кандидат искусствоведения,*
*старший преподаватель кафедры теории музыки*
*Белорусской государственной академии музыки*

На протяжении многих веков различные символические приемы играют значительную роль в музыкальных произведениях, равно как и в произведениях иных видов искусства. На сегодняшний момент символика продолжает оставаться невероятно востребованным явлением композиторского творчества. Чем же обусловлена столь высокая степень ее популярности в наши дни? Одной из причин, вероятно, можно считать возможность подчинить звуковой ряд определенной структурной логике, насытить его дополнительным уровнем содержания. В условиях стремительного темпа современной жизни, активного развития технологий приемы символики дают композитору возможность в сжатый временной отрезок сообщить больше информации. Содержательная безграничность и неисчерпаемость символа сообщают произведению некоторый элемент смысловой незамкнутости, требующий от слушателя додумывания, продолжения дешифровывания смысла прослушанного, что также расценивается искусствоведами как показатель-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ